***Аляксандр Карацееў***

# СУСВЕТНАЯ І НАЦЫНАЛЬНАЯ ЭТНААРГАНАЛОГІЯ Ў СІСТЭМЕ ПАДРЫХТОЎКІ ВЫКАНАЎЦАЎ ВЫШЭЙШАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ НА БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ ДУХАВЫХ ІНСТУРМЕНТАХ

У сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў духавога мастацтва Беларусі найбольш праблемным пытаннем з'яўляецца падрыхтоўка выканаўцаў на традыцыйных народных духавых і ўдарных інструментах беларусаў. Аналіз спецыяльнай літаратуры і іншых крыніц па праблемах народна-інструментальнага выканальніцтва з удзелам духавых інструментаў, сярод якіх вызвалі цікавасць працы І.Благавешчанскага [4, с. 103-104], І.Назінай [19-21], польскіх фалькларыстаў К.Мошінскога [22], Ч.Петкевіча [23], дазваляюць атрымаць некаторае ўражанне аб значнасці засваення пытанняў аб неабходнасці вывучэння традыцыйных беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў. Гэтым пытанням удзелілі ўвагу ў сваіх працах такія даследчыкі, як І.Назіна [19-21], А.Крамко [16], І.Мангушаў [17, с. 220-229]. Нягледзячы на багатую гісторыю існавання і эвалюцыю гэтых інструментаў, у маштабах рэспублікі пакуль не існуе мэтанакіраванага працэсу падрыхтоўкі выканаўцаў на традыцыйных беларускіх народных духавых і ўдарных інструментах. Прыкметнай падзеяй трэба адзначыць выданне фундаментальнай працы [6; 7; 12], якая дазваляе сёння рыхтаваць выканаўцаў на народных духавых інструментах [14]. Але ні на першапачатковай стадыі навучання (музычныя школы, школы мастацтваў ці сярэднеадукацыйныя школы, у якіх вывучаецца музыка), ні ў сістэме сярэдне-спецыяльнай адукацыі (музычныя вучылішчы, каледжы і г.д.) такога працэсу пакуль няма. Парадаксальным з'яўляецца і тое, што пытанні па вывучэнню традыцыйных беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў, падрыхтоўкі на іх адпаведных выканаўцаў, вырашаюцца толькі ў сістэме вышэйшай адукацыі (у асабнасці ў БДУКМ). У працэсе нашага даследвання гэтыя аспекты выступаюць як *аб'ект*, а пытанні аб мэтах, задачах, змесце і міжпрадметных сувязях дысцыпліны «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія (*духавыя і ўдарныя інструменты)*» вызначаны як *прадмет* даследванняў.

Адзначым, што дысцыпліна «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія (*духавыя і ўдарныя інструменты)*» для студэнтаў спецыяльнасці «Духавыя інструменты (народныя)» з'яўляецца адной з асноўных. Вопыт яе выкладання з 2000 года ў межах папярэдней дысцыпліны «*Арганафонія і арганалогія*» вызначыў аб'ектыўныя параметры падрыхтоўкі студэнтаў у адпаведнасці з распрацаванымі стандартамі [5]. Галоўная *мэта дысцыпліны*, якая была вызначана намі як прадмет даследванняў, – гэта не толькі засваенне студэнтамі дасканалых ведаў па пытаннях эвалюцыі народных музычных духавых, ударных інструментаў і іх функцыянальных асаблівасцяў, але і забеспячэнне падрыхтоўкі кампетэнтных, эрудзіраваных, высокакваліфікаваных, адказных і ініцыятыўных маладых спецыялістаў да будучай самастойнай творчай працы у якасці канцэртнага выканаўцы, артыста аркестра ці ансамблю, а таксама і выкладчыка. Гэта, на наш погляд, так званая *лакальная мэта дысцыпліны*. Таму пры выкладанні курса «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія (*духавыя і ўдарныя інструменты)*» неабходна абавязкова ўлічваць аб'ектыўныя і аптымальныя міжпрадметныя сувязі гэтага курса з іншымі дысцыплінамі спецыяльнасці, па якіх ажыццяўляецца падрыхтоўка студэнтаў. Сярод іх адзначым наступныя: 1) «Гісторыя мастацтваў»; 2) «Этнаграфія, міфалогія і фальклор»; 3) «Народна-інструментальная культура Беларусі»; 4) «Рэстаўрацыя і выраб беларускіх народных духавых інструментаў»; 5) «Музычная акустыка»; 6) «Інтэрпрытацыя народнай музыкі»; 7) «Методыка работы з фальклорным калектывам»; 8) «Методыка выкладання спецыяльных дысцыплін»; 9) «Гісторыя і тэорыя выканальніцтва на духавых і ўдарных інструментах»; 10) «Чытанне і аналіз аркестравых партытур»; 11) «Народна-аркестравае выканальніцтва»; 12) «Ансамблевае выканальніцтва»; 13) «Спецыяльныя народныя духавыя інструменты (*свістковыя, лінгвальныя, амбушюрныя*)»; 14) «Інфарматыка і кампутарныя тэхналогіі» і інш. Як бачым, панарама міждысцыплінарных сувязей курса «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія (*духавыя і ўдарныя інструменты)*» вельмі шырокая. Таму, з улікам гэтых абставін, падчас навучання ў вышэйшай навучальнай установе выкладчыкі са студэнтамі па вызначанай намі для даследвання дысцыпліны павінны вырашыць наступнае кола пытанняў і навучальна-педагагічных <u>*задач*</u>:

1) атрымаць грунтоўныя гістарычныя, музычна-тэарэтычныя веды аб народным духавым і ўдарным музычным інструментарыі не толькі Беларусі, але і аналагічным сусветным музычным інструментарыі ў кантэксце вывучэння гісторыі і сучасных тэндэнцый арганафоніі;
2) развіць адпаведныя музычна-творчыя навыкі вырашэння мастацкіх задач падчас выканання расшыфровак, аранжыровак і інтэрпрытацыі народнай музыкі, якія павінны выкарыстоўвацца будучымі маладымі спецыялістамі ў асабістай мастацка-прафесійнай самастойнай працоўнай творчай дзейнасці па далейшаму развіццю традыцый народна-інструментальнай спадычын Беларусі;
3) падчас выканання заданняў па планах індывідуальных, практычных заняткаў, падрыхтоўкі дыпломных работ рэалізаваць асабістыя творча-эксперыментальныя пошукі найбольш эфектыйных мастацка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вобразных інструментальных увасабленняў узораў нацыянальнай народнай традыцыйнай музычнай спадчыны, а таксама лепшых твораў сучасных кампазітараў Беларусі ў галіне народна-інструментальнага мастацтва;

4) асэнсаваць сацыякультурную значнасць і прэстыж народна-інструметальнай спадчыны Беларусі на сучасным этапе развіцця мастацкай культуры.

Актуальным пытаннем пры выкладанні дысцыпліны «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія (*духавыя і ўдарныя інструменты)*» з'яляецца, безумоўна, яе змест (гл. дадатак № 1), да якога намі былі распрацаваны неабходныя сродкі дыягностыкі пры вызначэнні ведаў студэнтаў (гл. дадатак № 2) і метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананню самастойнай работы студэнтамі (гл. дадатак № 3). Распрацаваныя намі матэрыялы, якія выкарыстоўваюца пры выкладанні дысцыпліны «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія» [8 – 15], падрыхтаваны намі вучэбна-метадычны комплекс і надрукаваная праграма дысцыпліны [15] дазваляюць студэнтам атрымаць дастатковыя веды аб гістарычнай эвалюцыі народнага музычнага духавога і ўдарнага інструметарыю, яго мастацка-выразных і тэхнічна-выканальніцкіх асаблівасцях і спецыфіцы, сацыякультурных функцыях і праблемах сучаснага выкарыстання ў мастацкай культуры. За перыяд навучання аналізуемай намі дысцыпліны студэнты павінны атрымаць дастатковае кола наступных *музычна-тэарэтычных прафесійных ведаў*, якія забяспечаць якасную прафесійную падрыхтоўку будучых маладых спецыялістаў па наступных пытаннях.

I. Тыпалогія, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці традыцыйных беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў (этнаарганалагічныя асаблівасці свістковых, язычковых, амбушурных, ударных народных музычных інструментаў, іх выразна-тэхнічныя магчымасці, натацыя, строй, дыяпазон і г.д.).

II. Сутнасць сольнага, ансамблевага, капэльнага выканаўства на традыцыйных беларускіх народных духавых і ўдарных інструментах (solo ў традыцыях народна-інструментальнай практыкі ці з выкарыстаннем сучасных і эксперыментальных выканальніцкіх тэхналогій; solo ў суправаджэнні фартэпіяна; solo ў суправаджэнні інструментальнага ансамбля ці капэлы беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў, кантрапункт, музычная арнаментыка і г.д.).

III. Спосаб афармлення музычнага твора для беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў (solo, ансамблевая ці аркестравая партыя, партытура для ансамбля ці аркестра).

IV. Гістарычныя эпохі і этапы эвалюцыі народных духавых і ўдарных інструментаў (сусветныя і нацыянальныя тэндэнцыі Беларусі).

V. Варыянты, інтэрпрытацыі, рэдакцыі музычных твораў (параўнальны аналіз размеркавання музычнага матэрыялу ў творах з выкарыстаннем беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў).

VI. Сацыякультурная значнасць канцэртна-выканальніцкай дзейнасці выканаўцаў на беларускіх народных духавых інструментах.

Атрыманне ведаў па вызначыных намі параметрах забяспечаць студэнтам таксама і магчымасць выканання асабістых заданняў у межах падрыхтоўкі адпаведных матэрыялаў з выкарыстаннем элементаў навукова-даследчай дзейнасці (рэферат ці выступленне на семінары; паведамленне ці даклад на пасяджэнні студэнцкага навукова-творчага гуртка, канферэнцыі па выніках НДДС; удзел у традыцыйным рэспубліканскім конкурсе студэнцкіх навуковых работ; напісанне курсавой ці дыпломнай работы; магчымая падрыхтоўка да паступлення ў магістратуру, аспірантуры і г.д.).

Падчас вывучэння дысцыпліны «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія (*духавыя і ўдарныя інструменты)*» з улікам засваення звестак аб асноўных беларускіх народных духавых і ўдарных інструментах у студэнтаў прадугледжваецца фарміраванне і ўдасканальванне наступных *прафесійных уменняў*:

I. *вызначэнне сольных, ансаблевых ці аркестравых цяжкасцей* і іх музыказнаўчы, творча-выканальніцкі аналіз з напісаннем рэкамендацый да іх увасаблення ў выканальніцкай практыцы;

II. *супастаўленне розных штрыхавых камбінацый* з мэтай іх дакладнага асэнсавання і размеркавання на працягу таго ці іншага твора для яго выканання з кантраснымі эфектамі;

III. *неабходная карэктура партый* для беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў (*solo, ансамбль, капэла)*;

IV. *вызначэнне і графічнае афармленне дынаміка-акустычных асаблівасцей* з мэтай дасягнення будучым выканаўцам на беларускіх народных духавых і ўдарных інструментах лагічнайсці ў насычанасці гучання;

V. асабістае выкананне вывучаемых твораў ці іх нотных фрагментаў на музычным інструменце, напрыклад – базавым як дудка, ці на дадатковых абавязковых інструментах, як жалейка, акарына, дуда, труба ці на эпізадычных інструментах, як саломка, чаратоўка, штархуны, бубен і г.д.

Вывучэнне студэнтамі дадзеннага курса прадугледжвае *развіццё* наступных *творча-практычных навыкаў*.

I. *Вызначэнне дакладнага характару музычнага твора і выбар адпаведнага музычна-інструментальнага арсеналу* з улікам неабходнай танальнасці і тэсітуры гучання твора.

II. *Выкананне неабходных практыванняў па напісанню сольнай партыі для таго ці іншага народнага духавога інструмента* з вызначэннем розных варыянтаў і камбінацый музычна-выразных сродкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

III. *Выяўленне абертонаў, аплікатурных цяжкасцей* для кожнага народнага духавога інструмента і іх адпаведнае напісанне ў партытуры ці аркестравай партыі.

IV. *Распрацоўка планаў для выканання самастойнай работы над музычным матэрыялам* з мэтай яго размеркавання для народных духавых і ўдарных інструментаў.

З мэтай засваення матэрыялаў дысцыпліны «Сусвутная і нацыянальная этнаарганалогія» прадугледжаны прагрэсіўныя метады і тэхналогіі навучання (наглядныя метады, выкарыстанне відэа- і аўдыё-матэрыяламі, нагляднымі дапаможнікамі і інш.), самастойная работа студэнтаў з рэкамендацыі асноўнага і дадатковага спісу.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія» ўсяго прадугледжана 120 гадзін, у тым ліку 48 гадзін аўдыторных заняткаў: лекцыі – 36 г., семінарскія заняткі – 12 г.. Форма кантролю – экзамен.

***Такім чынам***, роля ведаў, набытых студэнтамі падчас вывучэння курса «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія (*духавыя і ўдарныя інструменты)*» значна ўзрасце, калі будуць улічаны не толькі яго мэта і адпаведныя задачы, але і міжпрадметныя сувязі з іншымі дысцыплінамі ўніверсітэцкай падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. На наш погляд, гэта – галоўная ўмова прафесійнага станаўлення будучых спецыялістаў духавога мастацтва Беларусі ў галіне народна-інструментальнага выканальніцтва, а таксама працэсу папулярызацыі ведаў аб народна-інструментальнай нацыянальнай спадчыны беларускага народа. Вядома, што сёння некаторыя прыхільнікі сучасных тэндэнцый музычна-інструментальнага выканальніцтва вельмі катэгарычныя і скептычныя да існавання ў сучаснай музычнай практыцы народных інструментаў, лічачы іх «прымітыўнымі» [14]. Гэтым «почитателям высокого профессионального искусства» варта вывучаць неабходную спецыяльную літаратуру [8-23], завітаць на яскравыя, эмацыйныя, нацыянальна-каларытныя канцэрты вядучых фальклорных калектываў Беларусі і абавязкова памятаць аб тым, што народнае выканальніцтва кожнай краіны – гэта заўсёды невычарпальная крынічка нацыянальнага прафесійнага мастацтва [1, с. 68-70].

***Дадатак № 1***

**Прыкладны тэматычны план**
**дысцыпліны *«Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія»***

| № тэмы | Назва раздзела, тэмы | Агульная колькасць аудыторных гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | лекцыі | семінары |
| | Уводзіны. | 2 | |
| 1 | Этнаарганалогія як навука | 4 | 2 |
| 2 | Гісторыка-факталагічныя аспекты працэса эвалюцыі народнага духавога і ударнага музычнага інструментарыя Беларусі | 6 | 2 |
| 3 | Дынаміка-акустычныя асаблівасці традыцыйных беларускіх народных духавых і ударных інструментаў | 6 | 2 |
| 4 | Тыпалогія традыцыйных беларускіх народных духавых і ударных інструментаў у кантэксце сусветнавядомых класіфікацый музычных інструментаў | 6 | 2 |
| 5 | Мастацка-выразныя, тэхнічна-выканальніцкія асаблівасці традыцыйных беларускіх народных музычных духавых інструментаў | 4 | 1 |
| 6 | Асаблівасці тэндэнцый развіцця этнаарганалогіі і арганафоніі . Асаблівасці вывучэння этнаарганалогіі Беларусі | 4 | 1 |
| 7 | Асноўныя праблемы вывучэння этнаарганалогіі. Асноўныя этапы вывучэння мастацкіх асаблівасцей беларускіх народных духавых і ударных інструментаў | 4 | 2 |
| | **УСЯГО** | **36** | **12** |

***Дадатак 2***

**Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі**
**па дысцыпліне *«Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія»***

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

- падрыхтоўка пісьмовых кантрольных заданняў;
- напісанне рэфератаў, анатацый па асобных раздзелах дысцыпліны;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- вызначэнне адпаведнага спісу спецыяльнай літаратуры па асобных раздзелах дысцыпліны з мэтай напісання тэматычных анатацый аб мастацка-выразных і функцыянальных асаблівасцях беларускіх народных духавых і ўдарных музычных інструментах;
- напісанне па асобных тэмах дысцыпліны дакладаў на выніковыя навуковыя канферэнцыі аспірантаў, магістрантаў і студэнтаў;
- франтальнае вуснае апытанне студэнтаў на семінарах па тэмах дысцыпліны.

***<u>Дадатак №3</u>***

**Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў па дысцыпліне *«Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія»***

Самастойная работа студэнтаў па дысцыпліне «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія» ажыццяўляецца падчас пазааўдыторных заняткаў у бібліятэках, лабараторыі музычных інструментаў універсітэта, установ культуры, інтэрнаце. Змэтай яе эфектыўнай арганізацыі студэнтам мэтазгодна выконваць адпаведны аб'ём работы пасля знаёмства з матэрыяламі лекцыйных заняткаў і падчас падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў.

Дзеля ажыццяўлення самастойнай падрыхтоўкі студэнтаў, з мэтай засваення неабходных матэрыялаў дысцыпліны «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія», ім неабходна вызначыць сутнасць і змест тэрмінаў «*арганалогія*», «*этнаарганалогія*», «*арганафонія*», «*транспазіцыя*», «*інтэрвал транспазіцыі*» і адзначыць іх ў пісьмовай форме ў асабістых канспепктах.

З мэтай актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў прапануецца работа са спецыяльная літаратураў бібліятэчных фондаў па засваенню асаблівасцей гісторыка-фактaлагічных аспектаў працэса эвалюцыі народнага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя Беларусі з улікам прынцыпа храналогіі і адлюстравання найбольш вядомых гістарычных падзей і фактаў сучаснага існавання народнага музычнага інструментарыя.

Падчас падрыхтоўкі адпаведных матэрыялаў па вывучэнню дысцыпліны «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія» ў студэнтаў павінны фарміравацца уменні і навыкі пошука, адбору неабходных крыніц і самастойнага набыцця ведаў у працесе абагульнення праблемна-тэматычнай інфармацыі.

Эфектыўным спосабам засваення адпаведныхведаў па практычных пытаннях характырыстыкі народнага духавога і ударнага музычнага інструментарыя Беларусі павінна стаць пісьмовая характарыстыка беларускіх народных духавых і ўдарных музычных інструментаў з улікам іх функцыянальных і мастацка-выканальніцкіх асаблівасцей (лабіяльныя ці флейтовыя; лінгвальныя ці язычковыя; амбушурныя ці мундштучныя; ідіяфоны; мембранафоны).

Важнай умовай засваення трывалых ведаў студэнтамі па дысцыпліне «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія» з'явіцца знаёмства з нотным матэрыялам твораў, якія прызначаны дзеля выканальніцтва на беларускіх народных духавых і ўдарных інструментах (*solo, ансамбль, капэла*), а таксама адбор і праслухоўванне адпаведных фанаграм з мэтай вывучэння мастацка-выразных асаблівасцей узораў выступленняў сусветнавядомых і лепшых айчынных выканаўцаў на народных духавых і ўдарных музычных інструментах.

**Спіс літаратуры:**


1. Антоневич, В.А. Народное исполнительское искусство как один из источников обогащения профессионального творчества на современном этапе / В.А. Антоневич // Вопросы культуры и искусства Белоруссии: Респ. межвед. сб. – Мн.: Вышэйш. шк., 1982. – Вып. 1. – С. 68–71.
2. Беларуская народная інструментальная музыка / Фоназапісы, натацыя / Рэд. і сістэматызацыя найгрышаў, уступ. арт. і навук. камент. І.Д.Назінай. – Мн.: Навука і тэхніка, 1989. – 655 с. – (Бел. нар. творчасць / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору.)
3. Белорусские народные наигрыши / Сост. и авт. вступ.ст. И.Д.Назина; Под общ. ред. В.Петрова. – М.: Музыка, 1986. – 12с.
4. Благовещенский И.П. К истории белорусской народной инструментальной музыки / И.П. Благовещенский // Благовещенский И.П. Некоторые вопросы музыкального искусства (педагогика, эстетика, фольклор). – Мн., 1965. – С. 103–143.
5. Высшее образование. Первая ступень. Специальность 1-16 01 06 Духовые инструменты (по направлениям) 1-16 01 06-11 Духовые инструменты (народные): ОСРБ 1-16 01 06-11-2008. – Введ.07.08.2008. – Минск: Министерство образования Республики Беларусь, 2008. – 30 с.
6. Гром, У.М. Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах: вучэб.-метад. дапам. / У.М. Гром, А.Я. Крамко, І.А. Мангушаў. – Мн.: Бел. дзяр. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – Ч. 1. Сольнае выкананне – 259 с.
7. Гром, У.М. Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах: вучэб.-метад. дапам. / У.М. Гром, А.Я. Крамко, І.А. Мангушаў. – Мн.: Бел. дзяр. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – Ч. 2. Ансамблевае выкананне. – 217 с.
8. Коротеев, А.Л. Бытование амбушюрных духовых музыкальных инструментов в Беларуси (по материалам археологических изысканий, архивных исследований и анализа печатных изданий в контексте славянской


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

органологии) / А.Л. Коротеев // IV Міжнародная Кірыла-Мяфодзіееўскія чытанні, прысвечанныя Дням славянскага пісьменства і культуры: Матэрыялы чытанняў (Мінск, 24-26 мая 1998 г.). У 2 ч. Ч. 2 / ЕГУ, БУК; Рэдкал.: Пазнякоў А.У. (адк. рэд.) і інш. – Мн.: Бел. ун-т культуры, 1999. – 168-176.
9. Коротеев, А.Л. Генезис образования специалистов духового исполнительского искусства Беларуси (народно-инструментального, профессионального и любительского). // Музыкальное искусство и музыкальное образование на рубеже веков: Материалы научных конференций "Беларусь и музыкальное наследие ХХ столетия: поиски и обретения» (29-30 ноября 2001 г., Минск), «Музыкальное образование в контексте художественной культуры» (10-11 декабря 2002 г., Минск). – Вып. 1. – Мн.: Белорусская государственная академия музыки, 2004. – С. 138-146.
10. Коротеев, А.Л. Особенности развития духового искусства Восточной Европы: органологическое исследование и эволюция форм народно-инструментального исполнительства на духовых и ударных инструментах / А.Л. Коротеев // Украiньска культура в iменах i дослiдженнях. Науковi записки Рiвненьского державного iнституту культури. – Вiп. III – Рiвне: Рiвненський державний iнститут культури, 1998. – С. 296-320.
11. Коротеев, А.Л Фольклорные духовые инструменты белорусов в этнокультурном воспитании и художественном образовании детей и молодёжи (от музыкальной игрушки до разнообразия национального инструментария) / А.Л. Коротеев // "Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / Уклад. І навук. рэдакт. праф. І.І.Сучкоў. – Мн.: Бестпринт, 2004. – С- 87-94.
12. Коротеев, А.Л. Функциональные и этноорганологические особенности белорусских народных духовых инструментов / А.Л. Коротеев // Х Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 24-26 мая 2004 г.) / Рэдкал.: М.А.Бяспалая (адк. Рэд.) і інш. – Мн.: Бел. дзярж. Ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – С. 66-72.
13. Карацееў, А.Л.Мэты, задачы, змест і міжпрадметныя сувязі дысцыпліны «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія (*духавыя і ударныя інструменты)*» у сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў духавога мастацтва Беларусі вышэйшай кваліфікацыі // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, перайманя: зб. навуковых прац удзельнікаў IV Міжнар. навук.-практ. канф. / УА БДУКМ, Мінск, 29-30 красавіка 2010 г.– Мінск: БДУКМ, 2010. – С. 106-109.
14. Карацееў, А.Л. Неардынарная з'ява нацыянальна-выканальніцкага адраджэння / А.Л. Карацееў // Веснік БДУ культуры і мастацтваў. 2005, № 5. – С. 119-122.
15. Карацееў, А.Л. Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія:вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для напрамку спецыяльнасці 16 1-16 01 06 11 «Духавыя інструменты (народныя)». – Мінск: БДУКМ, 2013. – 24 с.
16. Крамко, А.Я. Беларускія народныя духавыя інструменты: вучэб. дапам. / А.Я.Крамко – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – 34 с.
17. Мангушаў, І.А. Праблемы рэканструкцыі, вырабу і ўкаранення ў сучасную музычную культуру старажытных фальклорных духавых інструментаў беларусаў / І.А. Мангушаў // "Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / Уклад. І навук. рэдакт. праф. І.І.Сучкоў. – Мн.: Бестпринт, 2004. – С- 220 – 229.
18. Музыкальные инструменты мира / пер. с англ. Т. В. Лихач; обл. М. В. Драко. – Мн.: Попурри, 2001. – 320 с. : ил.
19. Назина, И.Д. Белорусские народные музыкальные инструменты: самозвучащие, ударные, духовые / И.Д. Назина; ред. М.Я. Гринблат. – Мн.: Наука и техника, 1979. – 144 с., ил.
20. Назина, И.Д. Становление и развитие белорусского этноинструментоведения как специальной научной дисциплины / И.Д. Назина // Белорусская этномузыкалогия: Очерки истории (XIX-XX вв.) / З.Можейко, Т.Якименко, Т.Варфоломеева и др.; под. ред. З.Можейко. – Мн.: Тэхналогія, 1997. – С. 199-234.
21. Назіна, І.Д. Беларускія народныя музычныя інструменты / І.Д. Назіна. – Мн.: Беларусь, 1997. – 239 с.
22. Moszynski, K. Polesie Wscodnie. Materijaly etnograficzhne z wscodniego czesscib. Powiatu Mozyrskiego oraz z powiatu Rzeczyckiego / K. Moszynski. – Warzawa, 1928. – 304 s.
23. Pietkiewicz, Cz. Polesie Rzecsyckie: materijaly etnograficzhne / Cz Pietkiewicz.. – Warzawa, 1938. – Cz. 2. Kultura duchowa Polesia Rzeczyckiego – 459.

***Мирек Кордовский***

## ПОПУЛЯРИЗАЦИЯ ТРАДИЦИОННОЙ НАЦИОНАЛЬНОЙ ТАНЦЕВАЛЬНОЙ МУЗЫКИ В ТВОРЧЕСКОМ РЕПЕРТУАРЕ ДУХОВЫХ ОРКЕСТРОВ ПОЛЬШИ

Традиции музицирования в Польше способствовали созданию в деревнях простых мелодий с текстами, украшенными спецификой жизни польского народа, используя при этом богатство народных ритмов. Все это стало канвой для создания художественных произведений (колядок, пасторалей). Польские колядки, умиляющие своей красотой, полные достоинства, занимают особое место в истории польской культуры. Они дороги каждому поляку и навсегда остаются в памяти слушателей. Благодаря своей популярности, они стали важным фактором в художественной жизни поляков. Функция колядок не ограничивается исключительно ролью религиозных песен. Угнетение захватчиков вызывало сильные патриотические чувства и способствовало

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ